# БІБЛІЯТЭКАЗНАЎСТВА, КНІГАЗНАЎСТВА, БІБЛІЯГРАФАЗНАЎСТВА

70

УДК 655.4/.5(476)"1941/1945"

*С. А. ПАЎЛАВА*

## ДЗЕЙНАСЦЬ БЕЛАРУСКІХ ВЫДАВЕЦТВАЎ У ГАДЫ ВЯЛІКАЙ АЙЧЫННАЙ ВАЙНЫ

*Даследаванне прысвечана выпуску беларускіх кніг і перыядычных выданняў у 1941–1945 гг. Аўтар разглядае пытанні выдання, распаўсюджвання, ідэйнага зместу друкаванай прадукцыі – як дзяржаўных выдавецтваў, так і партызанскіх друкарняў. Асвятляецца роля друкаванага слова ва ўмацаванні патрыятызму, выхаванні, фарміраванні светапогляду і падтрымання маральнага духу абаронцаў Радзімы. Аналіз выданняў, іх колькасных і якасных паказчыкаў дае магчымасць зрабіць выснову аб стане і развіцці друку ў ваенныя гады, калі і ў якім кірунку змянялася тэматыка, якая літаратура займала ў розныя перыяды вайны найбольшую ўдзельную вагу.*

У ліку сродкаў, якія актыўна садзейнічаюць выхаванню, асобнае значэнне займае друк. Яго сацыяльная і выхаваўчая функцыі аказваюць вялікі ўплыў на духоўны свет чалавека. Таму невыпадкова ў апошнія гады навукоўцы розных спецыяльнасцей: журналісты, краязнаўцы, сацыёлагі, псіхолагі, гісторыкі, кнігазнаўцы імкнуцца высветліць характар уздзеяння друку на чытача, яго псіхалогію, светапогляд. Адной з малавывучаных праблем з'яўляецца фарміраванне духоўнага свету беларускіх партызан. Выдавецтвы краіны ў кароткі тэрмін перабудавалі сваю работу з улікам ваеннага становішча, здолелі мабілізаваць свае сілы на выданне ў значнай колькасці літаратуры, неабходнай чытачам акупаванай тэрыторыі.

У цяжкіх абставінах апынуліся беларускія выдавецтвы. 24 чэрвеня 1941 г. фашысцкая авіяцыя падвергла жорсткай бамбардзіроўцы горад Мінск, ператварыўшы ў руіны многія жылыя дамы, фабрыкі, заводы, бібліятэкі, у тым ліку і друкарню, дзе друкаваліся ўсе рэспубліканскія газеты, шматлікія часопісы, іншыя перыядычныя і неперыядычныя выданні.

Дзяржаўнае выдавецтва БССР не было эвакуіравана з Мінску. Работнікі выдавецтваў часткова ўліліся ў рады Чырвонай арміі, другія эвакуіраваліся ў розныя раёны абласцей краіны. Уся маёмасць выдавецтва, дакументы і рукапісы былі знішчаны. Неабходна было фактычна зноў арганізоўваць працу выдавецтва.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

У кастрычніку 1942 г. Цэнтральны Камітэт Кампартыі Беларусі прыняў пастанову аб аднаўленні работы Дзяржвыдавецтва БССР. У пастанове адзначалася, што для выдання палітычнай і мастацка-масавай літаратуры на беларускай мове больш планамерна і вялікімі тыражамі трэба аднавіць працу Дзяржвыдавецтва БССР і аб'яднаць у ім усе выданні ЦК КП (б) Беларусі – газеты, лістоўкі, плакаты, кнігі. Выдавецтва было перайменавана ў выдавецтва ЦК КП (б) «Савецкая Беларусь», месцазнаходжанне яго – Масква[1]. Рашэннем ЦК КП (б) Беларусі ў выдавецтве былі створаны дзве рэдакцыі: палітычнай і мастацкай літаратуры. Рэдакцыйна-вытворчы штат выдавецтва быў зацверджаны ў колькасці 23 чалавек, але, з-за адсутнасці кадраў, у 1942 г. і першай палове 1943 г. быў укамплектаваны толькі на 50 %. Для працы былі прыцягнуты беларускія пісьменнікі: К. Крапіва ў якасці галоўнага рэдактара, П. Броўка як рэдактар мастацкай літаратуры і І. Гурскі – рэдактар палітычнай літаратуры. На працягу 1943 г. выдавецтва паступова ўкамплектоўваецца неабходнымі кадрамі за кошт выкліканых у Маскву ранейшых супрацоўнікаў выдавецтва і падрыхтоўкі новых. Да канца года апарат выдавецтва ў асноўным быў укамплектаваны [2].

Выдавецтву рэспублікі, як і ўсёй краіне, прыйшлося перабудаваць сваю працу на новы, ваенны лад. Задача заключалася ў тым, каб пры рэзка скарочаных матэрыяльных рэсурсах, значна меншай колькасці работнікаў хутка забяспечыць кнігай, брашурай, лістоўкай, плакатам партызан, насельніцтва акупаванай тэрыторыі.

Тэматычны план выдавецтва быў зацверджаны ЦК КП (б) Б 5 студзеня 1943 г. у колькасці 62 назваў[2] аб'ёмам 215 друкаваных лістоў. Палітычнай літаратуры планавалася выдаць 31 назву аб'ёмам 69 лістоў. Фактычна ж выдавецтва выпусціла за год 23 назвы тыражом 493 тыс. экзэмпляраў.

Сярод кніг, выпушчаных выдавецтвам у 1943 г., неабходна адзначыць серыю брашур з шасці назваў па 3 тыс. экзэмпляраў аб Героях Савецкага Саюза-беларусах: Ціхане Бумажкове, К. Чорным, Міхале Сільніцкім, К. Крапіве, Льве Даватары, Феадосіі Смалячкове і інш. А. Кучар працу «На партызанскай зямлі» прысвяціў 1-й Беларускай партызанскай брыгадзе і яе легендарнаму камандзіру Герою Савецкага Саюза М. Ф. Шмырову. Вялікі грамадскі рэзананс выклікаў выдадзены «Савецкай Беларуссю» зборнік дакументаў пра зверствы нямецка-фашысцкіх акупантаў у Беларусі «Нічога не забудзем, нічога не даруем».

Сярод выданняў грамадска-палітычнай літаратуры неабходна адзначыць наступныя: «Беларусь была і будзе савецкай. Першы і другі антыфашысцкія мітынгі прадстаўнікоў беларускага народа», «Зварот воінаўбеларусаў да партызан і партызанак, да ўсяго беларускага народа», брашуру П. К. Панамарэнкі «Партызанскі рух у Вялікай Айчыннай вайне». Масавым тыражом выйшла кніга «Моладзь Беларусі ў баях за Радзіму», сярод аўтараў якой былі першы сакратар ЦК ЛКСМБ М. В. Зімянін, К. Крапіва, К. Чорны.

Некаторыя кнігі беларускіх аўтараў выходзілі ў выдавецтвах іншых рэспублік. Так, у Дзяржвыдавецтве Узбекскай ССР у 1941 г. выйшла брашура «Гераічныя партызаны Беларусі», аўтарамі якой былі П. К. Пана-

[1] НАРБ. Ф. 4. Воп. 29. Д. 1. Л. 16.
[2] НАРБ. Ф. 4. Воп. 47. Д. 27. Л. 62–63.



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

марэнка, сакратар ЦК КП (б) Б Р. Б. Эйдзінаў, гісторык А. Шэкун, сакратар ЦК ЛКСМБ М. А. Мінковіч.

З твораў мастацкай літаратуры былі выдадзены кнігі «Суд у лесе», «Голас зямлі» Я. Коласа, «Янук Сяліба» М. Танка, «Сцяг брыгады» А. Куляшова, «Дарога вайны» П. Панчанкі. Выйшаў у свет першы выпуск альманаха «Беларусь», у якім былі сабраны вершы і проза беларускіх паэтаў і пісьменнікаў. У гэтым жа годзе пачаўся выпуск падручнікаў для школ Беларусі[3].

У сувязі з адсутнасцю ўласнай паліграфічнай базы заказы выдавецтва выконваліся ў маскоўскіх друкарнях «Красный пролетарий» і «Известия». Аднак значна ўскладняла працэс своечасовага выдання літаратуры на беларускай мове адсутнасць у гэтых друкарнях неабходных беларускіх шрыфтоў.

Кнігі беларускіх паэтаў і пісьменнікаў перакладаліся на рускую мову. Толькі ў гады Вялікай Айчыннай вайны ў рускіх перакладах было выдадзена каля 20 кніг беларускіх паэтаў і пісьменнікаў. Так, Дзяржвыдавецтва выпусціла аднатомнік вершаў Я. Коласа, выбраныя творы Я. Купалы, кнігі «Будущность» Э. Самуйлёнка, «К родным берегам» П. Броўкі, зборнік твораў беларускіх аўтараў «За Советскую Беларусь», «Знамя бригады» А. Куляшова, зборнік апавяданняў М. Лынькова, паэму «Янук Селиба» М. Танка. У гэтым выдавецтве ў 1942 г. тыражом у 25 тыс. экзэмпляраў выйшаў зборнік «За Советскую Беларусь! Белорусская художественная литература о Великой Отечественной войне». Выдавецтва дзіцячай літаратуры выпусціла кнігу выбраных твораў Я. Купалы, выдавецтва «Молодая гвардия» – зборнікі вершаў П. Панчанкі «Тебе, Беларусь!» і А. Астрэйкі «Звездная дорога», зборнік вершаў беларускіх паэтаў «Беларусь в огне» і інш. У выдавецтве «Искусство» ў 1943 г. выйшаў зборнік «Белоруссия борется». У кнігу ўвайшлі літаратурна-мастацкія творы для тэатраў, эстрады і мастацкай самадзейнасці.

Шэраг кніг выдадзены па ініцыятыве ЦК ЛКСМ Беларусі. Так, у 1943 г. у выдавецтве «Молодая гвардия» выйшаў зборнік вершаў беларускіх паэтаў пра вайну «Беларусь в огне» пад рэдакцыяй П. Глебкі. Прадмову напісаў М. В. Зімянін. У кнігу ўвайшлі вершы вядомых беларускіх паэтаў Я. Коласа, П. Глебкі, М. Танка, П. Панчанкі, П. Броўкі, Я. Купалы, А. Куляшова, А. Бялевіча, Э. Агняцвет. Значную частку зборніка заняў партызанскі фальклор. Частка тыражу кнігі, як і іншыя творы беларускіх аўтараў, была дастаўлена і размеркавана сярод партызан [1]. У гэтым выдавецтве ў 1943 г. выйшла кніга М. В. Зімяніна «Молодежь Белоруссии борется», прысвечаная гераічнай барацьбе маладога пакалення рэспублікі з ворагам.

Па ініцыятыве ЦК ЛКСМБ кішэнным фарматам на беларускай мове была выдадзена кніжачка «У бой, моладзь Беларусі». Над назвай, акрамя эпіграфа многіх выданняў таго часу «Смерць нямецкім акупантам!», стаяць словы «Прачытай і перадай другому». У кніжачцы надрукаваны матэрыялы антыфашысцкага мітынгу беларускай моладзі, які адбыўся 12 мая 1942 г. З гарачымі, хвалюючымі словамі звярталіся яго ўдзельнікі – маладыя франтавікі, партызаны, працоўныя абаронных заводаў, эвакуіраваных на ўсход, прадстаўнікі інтэлігенцыі, якія сабраліся ў Маскве, –

[3] НАРБ. Ф. 4. Воп. 47. Д. 27. Л. 62–63.



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

да юнакоў і дзяўчат Беларусі, заклікаючы іх да барацьбы з ворагам. На мітынгу з новым вершам «Вастрыце зброю» выступіў М. Танк.

Восенню 1943 г. пачалося вызваленне Беларусі ад нямецка-фашысцкіх акупантаў. Да студзеня 1944 г. былі вызвалены цалкам 30 і часткова 14 раёнаў Магілёўскай, Віцебскай, Гомельскай і Палескай абласцей. У вызвалены Гомель пераехаў ЦК КП (б) Б і СНК БССР. 3 ліпеня 1944 г. вызвалены Мінск, а да канца месяца нямецка-фашысцкія акупанты былі выгнаныя з усёй тэрыторыі рэспублікі.

Пашыраючы выдавецкую дзейнасць, немагчыма было ў поўнай меры разлічваць на друкарскую базу ў вызваленых гарадах, таму што гітлераўскія захопнікі знішчылі ўсе друкарні Беларусі. Урон паліграфічнай базе склаў 46,9 млн руб., у тым ліку фабрыцы «Палесдрук» – 8,1 млн руб., друкарні І. В. Сталіна ў Мінску – 3,3 млн руб. Фашысты знішчылі 636 ратацыйных друкаваных, наборных, пераплётна-брашуравальных і іншых паліграфічных машын [2]. Аднак усе цяжкасці паступова пераадольваліся.

У сувязі з пераездам Дзяржвыдавецтва БССР у Мінск для выдання падручнікаў і завяршэння выпуску іншай літаратуры, здадзенай у вытворчасць друкарнямі Масквы, было прынята рашэнне пакінуць у Маскве аператыўную групу Дзяржвыдавецтва БССР у складзе 14 чалавек на чале з галоўным рэдактарам выдавецтва пісьменнікам П. Глебкам.[4]

Па дадзеных Кніжнай палаты БССР у 1944 г. выдавецтва выпусціла ў свет 41 назву кніг і брашур агульным тыражом 1139 тыс. экзэмпляраў.

Такім чынам, у гады вайны выдавецтвы краіны ў кароткі тэрмін перабудавалі працу з улікам ваеннай абстаноўкі, здолелі мабілізаваць усе сілы на выданне ў значнай колькасці літаратуры, патрэбнай фронту, савецкаму тылу, чытачам часова акупаваных тэрыторый. Выдадзеная ў гады вайны кніга знаходзіла сваіх чытачоў, з'яўлялася магутнай зброяй у барацьбе з гітлераўскай ідэалогіяй.

Некаторую колькасць кніг выдалі партызанскія друкарні. Гэта, як правіла, творы партызанскіх паэтаў і празаікаў. Так, у друкарні слуцкай раённай газеты выйшла кніга вершаў «Слуцкі пояс» беларускага паэта А. Астрэйкі, які ў той час знаходзіўся ў радах мсціўцаў. Партызаны брыгады «За Радзіму» імя А. К. Флегантава, у якіх была партызанская друкарня, надрукавалі зборнік вершаў свайго байца Я. Рака. У зямлянцы, пры святле газоўкі, партызаны набралі, надрукавалі і збрашуравалі 500 экзэмпляраў зборніка. Недасканалыя па форме, але выразныя па змесце вершы Я. Рака клікалі партызан да свяшчэннай барацьбы, напаўнялі іх сэрцы нянавісцю да захопнікаў, бясчынстваў на акупаванай тэрыторыі. У гэтай жа друкарні выдадзена асобнай кніжкай паэма партызана Я. Аўсянкіна «Отец-патриот», у якой відавочна прасочваецца ўплыў гогалеўскага «Тараса Бульбы». У дні вайны вобраз народнага героя быў блізкі і дарагі партызанам.

«Мститель» – так называецца зборнік вершаў з 24 старонак, выдадзены друкарняй Рудзенскага падпольнага райкама партыі. Яго аўтар – рускі пісьменнік, а ў гады Вялікай Айчыннай вайны беларускі партызан брыгады імя А. Я. Пархоменкі Мінскага злучэння – Усевалад Уладзіміравіч Саблін. Гравюры для вокладкі кнігі рабіў С. Т. Паслядовіч – супрацоўнік газеты «Бальшавіцкі шлях». У кніжцы змешчана 18 вершаў. Вось

[4] РДА сацыяльна-палітычнай гісторыі. Ф. 1. Воп. 6. Д. 229. Л. 25.



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

назвы некаторых з іх: «В ружье, народ!», «Мой свободный голос», «На пепелище», «Марш народных мстителей», «Тут спят герои наши», «Моя Москва». У вершах іншы раз няма вобразаў, не зусім удалая рыфма, мала рытмічнасці, затое ёсць грамадзянскі пафас, лютая нянавісць да ворага, непахісная вера ў перамогу. Любы з радкоў У. У. Сабліна перш за ўсё кліч да барацьбы. Але, можа быць, адна з самых выдатных якасцей творчасці паэта-партызана заключаецца ў тым, што ў ім нязменна знаходзілі водгук падзеі баявых будняў атрада. Загінулі ў баі таварышы аўтара – з'яўляецца верш аб адзінаццаці волатах. Дванаццацігадовы хлопчык здзейсніў гераічны ўчынак – яму прысвячаецца верш «Маленький партизан», затужыў па хаце воін – гэта стала тэмай «Письма к жене…». Тыраж кнігі быў абмежаваны – 70 экзэмпляраў. Распаўсюдзілі яе наступным чынам: 20 экзэмпляраў заслалі ў варожыя гарнізоны, столькі ж разведчыкі і падпольшчыкі занеслі ў акупаваны Мінск, астатнія распаўсюдзілі сярод партызан.[5]

У кастрычніку 1943 г. у друкарні партызанскай газеты «За Советскую Родину» была выдадзена кніга вершаў і апавяданняў маладога аўтара У. І. Кулікова «Им здесь не быть». Камсамольскі работнік, партызан прысвяціў кнігу 25-годдзю Ленінскага камсамола. У зборніку змешчаны вершы і апавяданні пра народных мсціўцаў: «Отомсти», «Задание выполнено», «Грозный час настал», «Гнев призывает к мщению», «Комсомол» і інш. Няхай гэтыя апавяданні недасканалыя ў літаратурных адносінах, але і сёння іх нельга чытаць без хвалявання, яны ўражваюць суровай праўдай жыцця, багаццем фактычнага матэрыялу.

Зборнік «Стихи партизан и партизанок Вилейской области», у які ўвайшлі 22 вершы пятнаццаці аўтараў, падрыхтаваў і выпусціў калектыў рэдакцыі і друкарні Вілейскага абкама КП (б) Б.

У адным з нумароў газеты «Партизан Белоруссии» – органа Пухавіцкага падпольнага РК КП (б) Б – была надрукаваная паэма партызанкі Я. І. Крайнік «Поход фашистских зверей». Па просьбе чытачоў гэты нумар газеты дадрукоўваўся пяць разоў, пасля чаго паэму Я. І. Крайнік надрукавалі асобнай кнігай [7].

У пачатку 1943 г. партызанская брыгада «Железняк» Мінскага злучэння выдала зборнік твораў партызанскіх аўтараў пад назвай «Железняк». Эпіграфам да зборніка ўзяты радкі з верша М. Ю. Лермантава «Паэт», у якім гаворка ідзе пра сапраўднае прызначэнне паэта ў дні «бед народных». Відавочна, лермантаўскія радкі пераклікаюцца з радкамі змешчанага ў зборніку верша партызана Я. Яблонскага «Мой стих», дзе аўтар кажа пра ролю партызанскага паэта:

*– Я сам боец и о бойцах*
*Пишу своим немудрым словом,*
*Я славлю сильные сердца*
*И мужество в бою суровом.*

Выдавалі кнігі ў тыле ворага і некаторыя партызанскія друкарні. У партызанскай друкарні брыгады «Старик» была надрукавана і распаўсюджана сярод мясцовага насельніцтва брашура «Партизанская война в

[5] Знамя юности. 1975. 20 февр.



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Белоруссии» [5, с. 99–101]. Былі выдадзеныя і некаторыя іншыя невялікія па фармаце кнігі.

Некалькі рукапісных зборнікаў партызанскай творчасці падрыхтавалі да выдання Віцебскі і Вілейскі падпольныя абкамы камсамола. Гэтыя зборнікі засталіся ненадрукаванымі, бо час апярэдзіў планы: фашыстаў выгналі з нашай зямлі і партызаны вярнуліся да мірнай стваральнай працы. Да выдання былі падрыхтаваныя апавяданні, аўтарамі якіх з’яўляліся партызаны і партызанкі, камандзіры і палітработнікі. Партызан У. Дуброўскі напісаў аповесць «Жараўцы» – аб баявых дзеяннях партызанскага атрада «Смерть фашизму», якім камандаваў Жараў.

Часта партызанскія друкарні выдавалі ўпадабаныя партызанамі творы рускіх і беларускіх паэтаў і празаікаў. Так, у 1942 г. партызанская друкарня (назва пакуль не ўстаноўлена) перадрукавала апублікаваны 7 лістапада 1942 г. у газеце «Известия» артыкул М. Ціханава «Будущее» [9]. Друкарні брыгад імя П. К. Панамарэнкі і В. І. Чапаева выдалі асобнай кніжкай паэму Я. Коласа «Адплата» [6]. Друкарня Рудзенскага РК КП (б) Б тыражом 400 экзэмпляраў выпусціла нарыс І. Эрэнбурга «Отплата» [8, с. 122].

Асаблівай папулярнасцю ў партызан карысталіся спеўнікі, таму некаторыя партызанскія друкарні выдавалі таксама зборнікі песень. Улетку 1943 г. зборнік новых песень пад назвай «На партызанскі лад» выпусціла друкарня рудзенскай падпольнай газеты. На яго вокладцы, зробленай супрацоўнікам газеты С. Т. Паслядовічам, намаляваны партызан-гарманіст, які расцягнутым гармонікам б’е фашыста. Сімвалічная і ёмістая карцінка. Рыхтаваў да выпуску кніжку рэдактар раённай газеты М. С. Сіротка. На першай старонцы змешчана любімая ў той час «Партизанская песня». Акрамя яе ў выданне ўвайшлі «Землянка», «Священная война» і іншыя папулярныя песні. Кніга хутка разышлася па атрадах і вёсках.

У 1944 г. «Сялянскай газетай» быў выдадзены «Сборник фронтовых и партизанских песен» [4]. Бягомльскі падпольны райкам КП (б) Б выдаў аналагічную па назве кнігу тыражом 70 экзэмпляраў [3]. У лютым 1944 г. выйшаў у свет «Сборник песен и частушек про Великую Отечественную войну», выдадзены Беластоцкім абкамам ЛКСМБ. Партызанская друкарня змагла выдаць яго памерам 15х11 сантыметраў у аб’ёме 25–30 старонак, тыражом 200 экзэмпляраў. Неабходна адзначыць, што ўсе партызанскія падпольныя выданні мелі амаль такі ж фармат і аб’ём.

Як паказвае аналіз назваў выдадзенай у гады вайны літаратуры, беларускія паэты і празаікі адлюстроўвалі гераічную барацьбу савецкага народа з фашысцкімі захопнікамі на франтах Айчыннай вайны і ў тыле ворага, звяртаючыся са старонак твораў да воінаў-франтавікоў, партызанаў, усяго беларускага народа з палымяным заклікам самаахвярна працаваць і змагацца ў імя перамогі над ворагам. У кнігах перыяду Вялікай Айчыннай вайны беларускія пісьменнікі стваралі незабыўныя вобразы савецкіх людзей, мужных і бясстрашных, якія любяць Радзіму, якія ненавідзяць фашысцкіх варвараў, якія помсцяць гітлераўскім акупантам за замах на Айчыну, за разбой і забойствы. Такія творы насілі ярка выражаны мабілізуючы характар, клікалі да бязлітаснай барацьбы з ворагам.

1. *Бендик-Ветров, Б.* Летопись незабываемых лет / Б. Бендик-Ветров // Революционный держите шаг. – М. : Мол. гвардия, 1975. – Вып. 6. – С. 210–212.



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

2. *Волк, А. А.* Книгоиздательское дело в Белоруссии: исторический очерк / А. А. Волк, А. И. Ракович. – Минск : БГУ им. В. И. Ленина, 1977. – 280 с.

3. Всенародное партизанское движение в Белоруссии в годы Великой Отечественной войны (июнь 1941 – июль 1944): документы и материалы. – Минск : Беларусь, 1978. – Т. 2. – Кн. 2. – С. 203.

4. *Гусев, В. Е.* Славянские партизанские песни / В. Е. Гусев. – Л. : Наука. Ленингр. отд-ние, 1979. – С. 6.

5. *Дедюля, И. П.* Партизанский фронт / И. П. Дедюля. – М. : Мол. гвардия, 1975. – 320 с.

6. *Марцелев, С. В.* Печать Советской Белоруссии: исторический очерк / С. В. Марцелев. – Минск : Беларусь, 1967. – 512 с.

7. *Осипов, Б. В.* Биография пишется смолоду / Б. В. Осипов. – М. : Политиздат, 1979. – 102 с.

8. *Саченко, И. И.* Война и публицистика / И. И. Саченко. – Минск : Наука и техника, 1980. – 280 с.

9. *Стасевіч, З. Р.* Лясныя выданні / З. Р. Стасевіч // Помнікі гісторыі і культуры Беларусі. – 1980. – № 1. – С. 10.

*S. PAULAVA*

## ACTIVITY OF THE BELARUSIAN PUBLISHING HOUSES DURING THE GREAT PATRIOTIC WAR

*The study is devoted to the publication of books and periodicals in 1941–1945. The author examines issues of the publication, distribution, ideological content of printed materials of Belarus in state publishing houses as well as in guerilla printing houses. The role of the printed word in patriotism and education strengthening, the outlook and moral spirit of the Motherland defenders' formation are highlighted. The analysis of publications, their quantitative and qualitative indicators making a conclusion about the status and the development of printing during the war period is made.*

Дата паступлення артыкула ў рэдакцыю: 26.03.2015.

УДК [002.1+002.2]:[165.194+17.022.1]

*Л. І. ДОЎНАР*

## КНІГА І ДАКУМЕНТ У КАНТЭКСЦЕ КАГНІТЫЎНА-АКСІЯЛАГІЧНАГА ПАДЫХОДУ

*Асноўная ўвага ў артыкуле сканцэнтравана на праблемах сутнаснага парадку пры суадносінах кнігі і дакумента, якія прэзентуюцца з пункту гледжання маральнай адказнасці ў фарміраванні навуковых канцэпцый і развіцця цывілізацыйных працэсаў: іх каштоўнасці і значнасці, духоўнасці, маральнасці, свабоды слова, актыўнасці і пасіўнасці, публічнасці і прадвызначэння, кіравання быццём і тварэння быцця. Робіцца акцэнт на аўтаномнасці кнігі праз яе пазнанне ў кніжнай культуры; праз веды, неабходныя для развіцця грамадства.*

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ